ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (751) ● Пятніца, 20 чэрвеня 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII

## АДЗІНЫМІ ДУМКАМІ

З 5 па 17 чэрвеня 1969 года ў Маскве праходзіла міжнародная Нарада 75 камуністычных і рабочых партый. Яна прыняла важныя дакументы і з'явілася значнай падзеяй у разгортванні барацьбы супраць імперыялізму, у справе дасягнення адзінства дзеянняў самых шырокіх народных мас ва ўсім свеце, новым этапам на шляху ўмацавання згуртаванасці камуністычнага руху на прынцыпах марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Шматтысячны калектыў універсітэта разам з усім савецкім народам выказвае задаволенасць вынікамі работы Нарады, горача падтрымлівае яе рашэнні і запэўнівае родную партыю, што зробіць усё магчымае для іх ажыццяўлення. Аб гэтым гаварылася ў мінулую сераду на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе, так заяўляюць выкладчыкі і студэнты ў час субяседаванняў, гутарак і палітінфармацый у інтэрнатах. Ва універсітэце шырока разгорнута вывучэнне дакументаў міжнароднай Нарады.





# У ДОБРЫ ЧАС!

*У той час, калі студэнты стацыянара напружана рыхтаваліся да залікаў і экзаменаў, абмяркоўвалі планы працоўнага семестра і летняга адпачынку, універсітэт гасцінна расчыніў свае дзверы перад новым папаўненнем. Старанна і клапатліва працавала прыёмная камісія завочнага факультэта. Сотні людзей прыходзілі сюды са сваімі надзеямі і сумненнямі, адны упэўненыя ў правільным выбары будучай спецыяльнасці, іншыя—яшчэ нерашуча вагаліся.*

*І вось наступіў урачысты для універсітэта і хвалюючы для абітурыентаў дзень першага ўступнага экзамена. Напісаны на дошках тэмы сачыненняў, узяты першыя экзаменацыйныя білеты. «У добры шлях!» — наказвалі сябры тым, хто імкнуўся стаць студэнтам універсітэта. Добрага пачатку жадалі ім выкладчыкі.*

*Больш 1700 рабочых, калгаснікаў, служачых прыйшлі ва універсітэцкія аўдыторыі, каб прадэманстраваць свае веды і ў гэтым спаборніцтве заваяваць права стаць студэнтамі.*

*Амаль на ўсіх аддзяленнях колькасць паступаючых у два і больш разоў перавысіла план прыёму. Так, на 50 месц аддзялення біялогіі пададзена 216 заяў, на 150 юрыдычнага — 441. Многа жадаючых спецыялізавацца па філасофіі, тры чалавекі на месца прэтэндуюць на аддзяленні журналістыкі.*

*Цяпер экзаменацыйныя хваляванні абітурыентаў амаль уляглiся. Новае папаўненне з багатым запасам ведаў прыйшло на завочны факультэт. «Сардэчна віншуем!» — гаворым мы новым сябрам. — Будзьце выдатнымі студэнтамі!»*

*А. КАРЭЛІЧ.*

*НА ЗДЫМКАХ: сачыненне па літаратуры пішуць абітурыенты завочнага факультэта.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

## ЗА ПРАВА НА ПРАПІСКУ Ў БДУ

Больш за сотню людзей самых розных узростаў, прафесій, сацыяльнага паходжання ўмомант сціхаюць, увага ўсіх скіравана на дошку, дзе экзаменатар выводзіць роўнымі літарамі назвы тэм для сачынення. Яны не такія ўжо складаныя, і многія адразу ж слова за словам выкладваюць свае думкі. Іншыя ж круцяцца, верцяцца, як на іголках. Ці то нечага не давучыў абітурыент, або доўга выбірае «лягчэйшую» тэму...

Ідзе гадзіна за гадзінаю... Але што гэта? Экзаменатар паднімае аднаго з абітурыентаў і выцягвае з яго стала доўгі гармонік-шпаргалку. Спроба несумленна заваяваць права вучыцца ў нашым універсітэце тут жа прысякаецца. Абітурыенту Кербезаву прышлося пакінуць аўдыторыю. Гэты выпадак адзінкавы, але непрыемны. Усе паступаючыя пісалі добра. Аб гэтым гаворыць факт, што з 430 чалавек толькі 12 атрымалі двойкі. Прыкладна такія ж вынікі і на журналістыцы, рускім і беларускім аддзяленнях, біялагічным і г. д.

Хацелася б выказаць толькі некалькі агульных заўваг. Яны зводзяцца да таго, што большасць абітурыентаў зрабілі сінтаксічныя памылкі. Няўменне лагічна правільна пабудаваць фразу, пісаць коратка, проста вядзе да стылістычных памылак. Часта думка губляецца, і сказ ператвараецца ў бязглуздзіцу, накшталт: «Данко умер, но народ под его руководством вышел из темного леса».

Падрыхтоўка па літаратуры, мове вызначае здольнасць чалавека па-свойму бачыць і разумець акружаючую рэчаіснасць. У адных абітурыентаў адказы роўныя, багатыя. Адчуваецца, што яны рыхтаваліся да экзаменаў напружана, уважліва. Такім і адзнакі выкладчык ставіць добрыя або выдатныя. Але былі і такія, што хацелі заслужыць станоўчую адзнаку толькі сваёй «рашучасцю» пайсці адказваць першымі, «аглушыць» экзаменатара незвычайнай думкай. Абітурыентка Бабкова, напрыклад, пачала адказваць «здалёк». Экзаменатары ў час паўзы імкнуцца падказаць ёй правільны шлях да адказу, але неўзабаве пераконваюцца, што яна зусім не ведае пастаўленага пытання.

Прыемна было слухаць адказы абітурыентаў, якія паступалі на аддзяленне журналістыкі. Найбольш грунтоўныя адказы на ўсе пытанні даюць тыя, хто прыходзіць ва універсітэт з рэдакцый газет, з фабрык, заводаў, калгасаў. Верыцца, што студэнцкія парты універсітэта зоймуць дастойныя людзі.

С. ДАНІЛЕВІЧ.

## НАШЫ ЛЕТНІЯ КЛОПАТЫ

*КАФЕДРА І ЗАВОЧНІКІ*

Набліжаецца летняя экзаменацыйная сесія студэнтаў-завочнікаў. Кафедры універсітэта прымаюць усе захады да таго, каб яна прайшла на высокім арганізацыйным і навукова-метадычным узроўні. Побач з іншымі кафедрамі такую падрыхтоўку вядзе і кафедра рускай мовы, якая аб'ядноўвае спецыялістаў некалькіх самастойных дысцыплін: сучаснай рускай літаратурнай мовы, дыялекталогіі, гісторыі літаратурнай мовы, гістарычнай граматыкі, старажытнарускай мовы, практычнай стылістыкі. Зараз на кафедры працуе адзін доктар і 13 кандыдатаў філалагічных навук. Усе яны чытаюць лекцыі студэнтам-завочнікам і кіруюць іх падрыхтоўкай у міжсесійны перыяд.

Асноўную ўвагу кафедра ўдзяляе павышэнню тэарэтычнага ўзроўню лекцыйных курсаў, якія чытаюцца студэнтам-завочнікам, і паглыбленаму авалоданню практычнымі навыкамі выкладання рускай мовы ў сярэдняй школе. У апошнія гады завочнікам былі прачытаны новыя спецкурсы («Гістарызм у выкладанні рускай мовы і пытанні культуры мовы», «Гісторыя агульнаславянскай лексікі», «Прыслоўе і катэгорыя стану» і інш.), распрацаваны праграмы спецсемінараў, метадычныя ўказальнікі па асобных раздзелах курса сучаснай мовы, кантрольныя заданні, тэматыка дыпломных і курсавых работ. На пасяджэннях кафедры сістэматычна заслухоўваюцца справаздачы выкладчыкаў аб рабоце з завочнікамі, абмяркоўваецца якасць рэцэнзіравання кантрольных работ, а таксама пытанні навукова-метадычнай дапамогі студэнтам (пісьмовае і вуснае кансультаванне, сустрэчы ў дні завочніка і інш.).

На жаль, яшчэ не ўсе студэнты-завочнікі выконваюць свае абавязкі перад вышэйшай навучальнай установай. Наглядаюцца шматлікія выпадкі парушэння тэрмінаў прадстаўлення кантрольных работ, няўкі на кансультацыі, слабай падрыхтаванасці да экзаменаў і залікаў.

М. БУЛАХАЎ,
прафесар, загадчык кафедры рускай мовы.

## ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕМ ПАМЯТАЦЬ

Зусім нямнога часу засталося да той хвіліны, калі нам уручаць дыпломы. Гэта будзе самы радасны і, напэўна, самы журботны момант у жыцці усіх, каму давядзецца развітвацца з універсітэтам. Кожны ў душы пашкадуе, што не будзе ўжо больш стаяць ля аўдыторый, крыху нярвавацца, крыху быць разачараваным. Рэдкімі стануць сустрэчы з людзьмі, разам з якімі пройдзена шэсць гадоў вучобы.

Але будзе прыемна ўспомніць тых, хто не шкадуючы часу і сіл, дапамагаў нам. І перш за ўсё — Генрыету Анатольеўну Дунаеву, самага добрага, самага блізкага сябра завочнікаў. Гэта яна дапамагала нам вырашаць усе пытанні са здачай экзаменаў, падказвала, што неабходна рабіць, каб паспяхова праходзіла ўся вучоба. Удзячны мы і І. Н. Карбалевічу, Р. А. Шабеку, У. Т. Водневу, М. В. Мяцельскаму і многім іншым.

Хто не ведае, як цяжка вучыцца завочна! Гэта многія бяссонныя ночы і ні аднаго свабоднага дня. Але, нягледзячы на гэта, большасць вытрымала гэтае цяжкае выпрабаванне.

Пакідаючы універсітэт, мы вынесем самае лепшае, чаму навучыліся тут, каб выхоўваць наша маладое пакаленне дастойнай зменай старэйшых таварышаў.

У наш век — век касмічных адкрыццяў і бурнага развіцця навукі — краіне патрэбны адукаваныя, усебакова развітыя людзі. І мы абяцаем, што ўсе свае веды будзем аддаваць выхаванню моладзі.

*Студэнты VI курса матфака.*

Клапатлівая і напружаная пара цяпер на завочным факультэце. Толькі што закончыліся ўступныя экзамены ў абітурыентаў, поўнасцю акунуліся ў гарачую сесію студэнты, а выпускнікі-дыпламанты паспяхова абараняюць свае работы.

Аб справах завочнікаў мы расказваем сёння на старонках нашай газеты.



Паспяхова адказвае на ўступным экзамене па літаратуры палявод калгаса «Чырвоны Сцяг» Зінаіда Хадакоўская. Экзаменатары І. І. Сачанка і А. Г. Слука аднадушна ставяць адзнаку «выдатна». Фота М. Нечыпарэнкі.

*ПРАБЛЕМЫ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ*

# НЯВЫКАРЫСТАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Напэўна, многія чулі жарт пра салаўя і вераб'я, якія скончылі кансерваторыю. Салавей навучыўся выдатна спяваць, а верабей толькі чырыкаць, бо ён быў завочнікам.

Жарты жартамі, але і ў іх ёсць доля праўды. У студэнтаў стацыянара сапраўды больш магчымасцей для паспяховай вучобы. Яны слухаюць лекцыі ў аб'ёме ўсёй праграмы, больш часу могуць удзяляць вучэбным дапаможнікам, з імі больш праводзіцца практычных заняткаў.

Методыка навучання студэнтаў стацыянара механічна перанесена і на завочнікаў, толькі ў міні-варыянце. Ім чытаюць мінімум лекцый, у іх мінімум лабараторных заняткаў і г. д. Але і пры ўсіх гэтых «міні» атрымліваецца максімум загружанасці ў час экзаменацыйнай сесіі.

Такім чынам, асноўнай крыніцай ведаў для студэнта-завочніка з'яўляецца самастойная работа з кнігай. Аднак большасць падручнікаў напісана для студэнтаў стацыянара, у разліку на тлумачэнні выкладчыкаў у час лекцый. Да таго ж, завочнікі з сельскай мясцовасці часта не могуць своечасова атрымаць неабходную літаратуру. Прачытае такі студэнт 300—400 старонак падручніка перад экзаменамі, і ў галаве — вінегрэт. Добра тады, калі ён хоць што-небудзь «чырыкае» экзаменатару.

Вядома, сказанае вышэй не з'яўляецца навіной. Ва ўсіх вну краіны вядуць пошукі мерапрыемстваў па паляпшэнню методыкі навучання завочнікаў. У некаторых вну пачынаюць практыкаваць чытанне лекцый паміж сесіямі — у суботу і нядзелю. Але гэта не зусім прыймальна для студэнтаў, якія жывуць далёка ад навучальнай установы.

Многія вну краіны пайшлі па іншаму шляху — арганізавалі выданне лекцый па асноўных дысцыплінах (тыражом 1000—1500 экз.). Студэнты, і не толькі завочнікі, ахвотна іх купляюць. Матэрыял, выкладзены ў гэтых лекцыях, служыць каркасам, які потым у працэсе работы над літаратурай абрастае дэталямі і становіцца стройным будынкам ведаў. На экзамене студэнт не заблудзіцца ў такім будынку, бо ведае яго канструкцыю, хоць асобныя дэталі могуць і забыцца.

Каштоўнасць друкаванай лекцыі ў тым, што яна з'яўляецца своеасаблівым ключом да падручніка. Без такога ключа ў іншым падручніку, дзе мноства падрабязнасцей, можна не зразумець асноўнага. Як кажуць, за дрэвамі не ўбачыць лесу.

У нашым універсітэце ёсць сваё выдавецтва. Таму наладзіць выданне лекцый будзе не вельмі складана. Студэнты першага-трэцяга курсаў завочнага факультэта аддзялення біялогіі былі б вельмі ўдзячны за выданне лекцый М. М. Драко па заалогіі, Н. К. Кудрашовай — па сістэматыцы вышэйшых раслін, М. Н. Кацібнікава — па фізіцы, А. І. Ючанкі — па гісталогіі і эмбрыялогіі, а таксама лекцый іншых выдатных выкладчыкаў найбольш складаных дысцыплін.

У вывучэнні такіх дысцыплін, як анатомія чалавека, гісталогія і эмбрыялогія, заалогія, батаніка, цыталогія, мікрабіялогія, генетыка, глебазнаўства і іншых, вялікую карысць завочнікам маглі б даць каляровыя дыяфільмы. Выпуск іх ва ўмовах універсітэта для продажу студэнтам-завочнікам не ўяўляе вялікіх цяжкасцей.

Варта падумаць і аб стварэнні фанатэкі з запісамі асобных лекцый на магнітафоннай стужцы, каб потым перапісваць іх па заяўках студэнтаў-завочнікаў (вядома, за адпаведную плату). Паслухаць такі запіс лекцыі можна дома не адзін раз і добра засвоіць матэрыял. Тады можна было б паменшыць колькасць лекцый у перыяд сесіі, а замест іх больш часу адвесці на кансультацыі і практычныя заняткі.

Адным словам, пара шырэй выкарыстоўваць сучасныя тэхнічныя сродкі для паляпшэння методыкі завочнага навучання. Вядома, вераб'я не ператворыш у салаўя, але ж студэнты не вераб'і, ім можна эфектыўна дапамагчы паспяхова выконваць свае вучэбныя планы.

**П. ЛАХАДАНАЎ,**
**студэнт II курса аддзялення біялогіі завочнага факультэта.**

*У ДАПАМОГУ ЛЕКТАРУ*

**магчымую дапамогу і падтрымку працоўным масам Беларусі ў іх барацьбе супраць панавання, эксплуатацыі і прыгнёту і ў ахове іх свабоды і незалежнасці ад спроб замежных заваяванняў». Такім чынам, РСФСР не толькі прызнала сапраўдную самастойнасць БССР, але і гарантавала ёй усемагчымую дапамогу.**

**Пасля ўтварэння БССР і прызнання яе незалежнасці ўрад РСФСР і асабіста У. І. Ленін прытрымліваліся пазіцый строгай павагі і аховы яе суверэнітэту. Нават ва ўмовах складанага становішча ў час вайны з белапалякамі У. І. Ленін патрабаваў ад усіх без выключэння савецкіх улад і прадстаўнікоў РСФСР безумоўнага прытрымлівання самастойнасці БССР.**

**Шмат увагі У. І. Ленін удзяляў рашэнню пытанняў аказання дапамогі Беларускай ССР у справе аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі, арганізацыі дзяржаўнага апарату, развіцця яе эканомікі і культуры, падрыхтоўкі нацыянальных кадраў і г. д. Ён не пакідаў без вырашэння ні аднаго пытання, звязанага з задавальненнем патрэб БССР. Так, напрыклад, у снежні 1920 г., пасля таго, як Ленін пабываў на нарадзе беспартыйных сялян-дэлегатаў VIII Усерасійскага з'езда Саветаў і паслухаў іх выступленні, ён разаслаў членам ЦК і наркомам свае заметкі «На беспартыйным сходзе». У гэтых заметках, у сувязі з выступленнем дэлегата ад Беларусі, гаварылася: «З Беларусі (Мінская губерня). Солі, жалеза і ўсяго, каб засеяць усю зямлю. Трэба даць...» (Ленінскі зборнік XXXV, стар. 190).**

**Пастаянная ўвага У. І. Леніна, яго клопаты аб патрэбах Беларускай ССР, указанні аб дапамозе ў аднаўленні народнай гаспадаркі, у развіцці яе эканомікі, культуры і г. д. садзейнічалі ўмацаванню БССР. Гэтыя клопаты і ўвага дазволілі беларускаму народу ўмацаваць грамадскі і дзяржаўны лад. Дзякуючы ім Беларуская ССР заняла дастойнае месца сярод раўнапраўных суверэнных нацыянальных рэспублік.**

**С. ВІХАРАЎ,**
**дацэнт.**

# АДПАВЯДАЕ ВЫШЭЙШЫМ ПАТРАБАВАННЯМ

**Час абароны дыпломных. Ззаду засталіся напружаныя гадзіны і дні работы ў бібліятэках і архівах, горы прачытаных кніг і дакументаў. Сабраны ўадзіна разрозненыя дадзеныя, абагулены вынікі эксперыментаў, зроблены і аргументаваны свае адкрыцці. Работа закончана і прадстаўлена на суд кіраўніка, рэцэнзента, камісіі... І тады нярэдка гучаць словы: «Адпавядае вышэйшым патрабаванням». Так, вельмі многа работ дыпламантаў-завочнікаў — біёлагаў і географаў, гісторыкаў і журналістаў, фізікаў і матэматыкаў, юрыстаў і літаратуразнаўцаў — атрымліваюць высокую ацэнку. Адзначаецца актуальнасць тэматыкі, глыбіня даследаванняў і практычная каштоўнасць выкананых завочнікамі работ. Пара абароны— гэта пара сталасці былых студэнтаў.**

**Сёння мы прадстаўляем чытачам адну з многіх работ, якія заслужылі пахвальныя водгукі.**

**Студэнтку VI курса аддзялення гісторыі Л. М. Пекаву прыцягнула тэма «Барацьба У. І. Леніна за згуртаванне левых сіл у міжнародным рабочым руху і стварэнне III Камуністычнага Інтэрнацыянала». Гаворачы аб мэце сваёй работы, дыпламантка падкрэслівае: «Ужо сам факт пастаноўкі на разгляд міжнароднай Нарадай гэтай праблемы (адзінства дзеянняў камуністычных і рабочых партый, усіх антыімперыялістычных сіл. — Рэд.) сведчыць, што камуністы неаслабна трымаюць у цэнтры сваёй увагі пытанні, якія для народаў свету маюць самае рашаючае, самае жыццёвае значэнне.**

**Але адзінства сіл сусветнага рэвалюцыйнага працэсу, адзінства дзеянняў усіх антыімперыялістычных сіл дасягаецца ў жорсткай барацьбе з ідэолагамі антыкамунізму, тэарэтыкамі правага і «левага» рэвізіянізму, якія спрабуюць аслабіць міжнародны камуністычны рух. Рэвізіяніcцкія элементы і цяпер распаўсюджваюць ілюзіі, нібы можна перайсці да сацыялізма ў межах буржуазнай законнасці, буржуазнай дэмакратыі, без дыктатуры пралетарыяту.**

**У наш час інтарэсы сапраўднага міру і бяспекі народаў патрабуюць рашучых і неадкладных мер, накіраваных на спыненне амерыканскай агрэсіі ва В'етнаме, на прадухіленне новых ваенных канфліктаў, на ўмацаванне сяброўскіх сувязей паміж народамі. Таму ў барацьбе супраць імперыялізму адзінства міжнароднага камуністычнага і рабочага руху набывае першаступеннае значэнне. У сувязі з гэтым узрастае роля і значэнне марксісцка-ленінскага вучэння ўцэлым і асабліва дзейнасці У. І. Леніна ў гады першай сусветнай вайны па згуртаванню левых сіл у міжнародным рабочым руху.**

**Мэта работы — паказаць шматгранную, нястомную барацьбу У. І. Леніна супраць апартунізму, за згуртаванне левых сіл і ўтварэнне III Камуністычнага Інтэрнацыянала»...**

**А цяпер — слова рэцэнзенту кандыдату гістарычных навук М. ПАШКЕВІЧУ: «Дыпломная работа, выкананая Пекавай, сведчыць аб тым, што яе аўтар паспяхова справіўся з пастаўленай задачай. Глыбока вывучыўшы матэрыялы тэмы, карыстаючыся першакрыніцамі, аўтар паказала барацьбу У. І. Леніна з апартунізмам, сацыял-шавінізмам, цэнтрызмам у перыяд першай сусветнай вайны. На багатым фактычным матэрыяле паказана барацьба У. І. Леніна за стварэнне III Камуністычнага Інтэрнацыянала. Дыпломная работа Л. М. Пекавай сведчыць аб тым, што яе аўтар здолеў на вялікім фактычным матэрыяле, карыстаючыся навуковай аргументацыяй, дакладна і даволі поўна раскрыць тэму.**

**Дыпломная работа студэнткі Л. М. Пекавай поўнасцю адпавядае самым высокім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да падобных прац. Пасля нязначнай дапрацоўкі яна можа быць апублікаванай і паслужыць добрым дапаможнікам для вывучаючых гісторыю КПСС».**

**Л. КОРЗУН.**



# ПРАКТЫКА

## СПАДАБАЛАСЯ ЎСІМ

Пачатак гэтага месяца наш першы курс аддзялення геаграфіі завочнага факультэта правёў на палявой практыцы па геадэзіі ў раёне Гарадка. Месца там маляўнічае: лес, рэчка, ёсць рабочы палігон. Усіх нас чакала новая і цікавая справа. Курс, 70 чалавек, быў разбіты на рабочыя брыгады па 8—9 чалавек. Нам выдалі палаткі. І работа закіпела. На пустэчы на ўскраі лесу вырас палатачны гарадок. А вечарам сабраліся ўпершыню ля палявога кастра. Твары ва ўсіх іскрыліся радасцю. Над лесам зазвінелі песні, жарты, вясёлы задорны смех.

Пасля адбою — цішыня. Зрэдку яе парушаў толькі крык начной птушкі ды стук вёдзер на кухні, дзе корпаліся нашы пакуль што нявопытныя павары.

Сон на свежым паветры прыйшоўся да спадобы ўсім. Раніцай хутка памыліся ў рэчцы і праз некалькі хвілін брыгадамі выстраіліся на лінейку. Брыгадзіры дакладваюць кіраўніку практыкі старшаму выкладчыку Р. А. Жмойдзяку аб гатоўнасці да работы. Атрыман дакладны інструктаж і першае заданне.

Смачным аказалася на свежым паветры і сняданне. Павары папрацавалі на славу і атрымалі высокую ацэнку сваіх таварышаў.

Цікавым быў першы дзень. Працоўнае заданне— работа з тэадалітам. Усе брыгады выдатна засвоілі інструмент, навучыліся ім карыстацца. Паспяхова выканана і наступнае заданне.

Для ўсіх студэнтаў практыка аказалася карыснай. Навучыліся карыстацца складанымі інструментамі, афармляць дакументацыю, набылі навыкі ў вычэрчванні планаў тапаграфічных карт і планаў вокамернага здымку. Цяпер, зірнуўшы на карту, мы бачым не толькі нейкія мудрагелістыя крывалінейныя контуры, кружкі, розныя кручкі і завітушкі—мы бачым мясцовасць. Вялікіх намаганняў каштавала гэта навука нашым педагогам Р. А. Жмойдзяку, С. Ф. Драко і Б. А. Мядзведзеву. Яны рабілі за дзень шматкіламетровыя пераходы ад адной брыгады да другой і своечасова папраўлялі нашы промахі ў гэтай складанай, цяжкай, але цікавай рабоце. Тут яны навучылі нас вельмі многаму. За гэта ім вялікая прызнанасць і ўдзячнасць усяго курса.

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*



*Даюць справаздачу выпускнікі-завочнікі філалагічнага факультэта. Паспяхова абараняе дыпломную работу па тэме «Лірычная проза В. Салаухіна» студэнтка з Бабруйска Э. П. Мануйка. Фота М. Нечыпарэнкі.*

# ПРАКТЫКА СПАДАБАЛАСЯ ЎСІМ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Не даводзілася нам сумаваць і вечарамі ля кастра. Многія з нас ведалі, што наш аднакурснік Міхаіл Іванавіч Кіслоў, настаўнік Смалявіцкай СШ, у суровыя ваенныя гады быў партызанскім разведчыкам брыгады «Смерць фашызму». ведалі, што ён і цяпер вядзе перапіску са сваімі баявымі сябрамі - інтэрнацыяналістамі. І як толькі Міхаіл Іванавіч з'яўляўся ля кастра, нашы рабяты прасілі яго расказаць што-небудзь з партызанскага жыцця. Расказы гэтыя зацягваліся за поўнач. З затоеным дыханнем слухала моладзь успаміны ветэрана пра тыя далёкія суровыя ваенныя гады.

Калі размова зайшла аб тым, як дзейнічалі ў складзе брыгады палякі, французы, бельгійцы, славакі і нямецкія антыфашысты, Міхаіл Іванавіч нібы ў доказ дастаў з кішэні запісную кніжку, дзе былі фатаграфіі, і паказаў іх нам. На адной— француз Марсель Сазі, а на другой мы пазналі без цяжкасці генерала Людвіга Свабоду. на адваротным баку надпіс: СССР, Мінская вобласць, г. Смалявічы, Садовая, 11. Кіслову Міхаілу Іванавічу. І далей віншаванні і пажаданні да дня 1 Мая 1969 года на славацкай мове. І мы падумалі, як далёка гэтыя людзі адзін ад другога, а іх сэрцы зусім побач. Спаяла іх дружбу сумесна пралітая кроў у барацьбе супраць фашызма. Мы верым, што такая дружба паміж народамі, якая дасталася дарагой цаной, будзе вечнай і непарушнай.



Нягледзячы на свой немалады ўзрост, Міхаіл Іванавіч працягвае вучыцца і паказвае прыклад маладым. Яго курсавая работа па землезнаўству ацэнена на выдатна. Вось вытрымка з рэцэнзіі: «У даволі грунтоўнай рабоце, напісанай на ўзроўні сучасных ведаў, аўтар добра раскрывае тэму курсавой... Мы лічым, што аўтар можа смела рэкамендаваць сваю працу выкладчыкам гісторыі і геаграфіі...»

Паспяхова здаў Міхаіл Іванавіч залікі па нямецкай мове, геадэзіі, добрую ацэнку атрымаў на экзамене па геадэзіі.

Міхаіл Іванавіч — герой кнігі І. П. Дзядзюлі «Лясная гвардыя», ганаровы піянер дружыны імя Героя Савецкага Саюза Пятра Купрыянава. Мы вельмі задаволены, што сярод нас на палявой практыцы аказаўся такі чалавек. Яго расказы аб тым, як кавалася перамога над фашызмам, як у тыя суровыя гады моладзь нашага ўзросту са зброяй у руках абараняла сваю Радзіму і праяўляла мужнасць і адвагу, дазволілі нам разам з палявой практыкай прайсці своеасаблівы курс ваенна-патрыятычнага выхавання.

*Р. МАКАРЭВІЧ,*
*староста курса.*



## СТУДЭНЦКІЯ СВЯТЫ І БУДНІ

*Радасная падзея адбылася нядаўна ў выпускнікоў факультэта журналістыкі: пасля шматлікіх лекцый і семінараў, хвалюючых залікаў і экзаменаў, пасля цікавай вытворчай практыкі і абароны дыпломных работ яны атрымалі дыпломы, якія сведчаць аб іх вышэйшай універсітэцкай адукацыі. Наш фотакарэспандэнт М. Нечыпарэнка зазняў былую студэнтку, а цяпер паўнапраўнага спецыяліста Т. Якаўлеву (здымак злева) ў адзін з самых хвалюючых момантаў у яе жыцці, калі яна атрымала высокае пасведчанне.*

* * *

*У навучэнцаў падрыхтоўчага факультэта пакуль што ідзе сесія. Яны разам з усімі студэнтамі універсітэта старанна рыхтаваліся да гэтай пары. На здымках унізе вы бачыце в'етнамскіх студэнтаў у час здачы экзаменаў па матэматыцы і геаграфіі.*

## РАМАНТЫКА—У ПРАЦЫ

**Нясцерпная гарачыня. Хочацца піць, хочацца схавацца ад гэтага бязлітаснага сонца. Але куды!.. Вакол стэп, чыстае неба і сонца, пякучае сонца.**

**Мой напарнік Валодзя Шэлест, як заведзены, бегае ад саманнай формы ў замес, ад замесу да формы. І гэтак без перапынку. Я ледзве паспяваю за ім. Мы працуем усяго некалькі дзён, але ўжо дастаткова асвоілі тэхналогію саманных работ і паспяхова спраўляемся з нормай, хоць яна вельмі вялікая: трэба зрабіць 1000 саманін. Баляць рукі, спіна, ногі. Хочацца кінуць усё і паваліцца на зямлю. Здаецца, яшчэ адна форма — і звалюся з ног. Я кідаю позірк на хлопцаў. Ім таксама нялёгка. Але ж трэба працаваць. Трэба выконваць норму. Ніхто цябе сюды не прымушаў ехаць, сам пажадаў. Цябе вабіла рамантыка казахстанскага стэпу. Але тут, акрамя рамантыкі, трэба і працаваць не чуючы рук.**

**Праўду гавораць: на цаліну едуць, каб паспрабаваць свае сілы.**

**Побач з намі працуюць Іван Чыгір і Валодзя Гураль. Хлопцы вельмі спрытна спраўляюцца з работай. У Івана рукі моцныя, бы землечарпалка. Яму хапае ўсяго двух рухаў, каб напоўніць форму. Не адстае ад яго і Валодзя. І таму хлопцы заўсёды робяць больш за іншых.**

**Незаўважальна падыходзіць перапынак. Мы кідаемся проста на зямлю, падлажыўшы рубашку, каб не калолася вярблюджая калючка.**

**У канцы рабочага дня падлічваем формы. Так, сёння больш зрабілі, чым учора, хоць і стаміліся менш: пачынаем уцягвацца, менш робім лішніх рухаў, прыходзіць спрыт.**

**Вечар. На гарызонце паказваецца воблачка пылу. Гэта наш шафёр. Хлопцы-саманшчыкі куляюцца ў кузаў. Нам уступаюць месцы: усе лічаць нашу работу самай цяжкай, нас паважаюць.**

**Стомленыя вяртаемся дамоў. Хочацца хутчэй адпачыць. Але, як толькі Гена Стрыжэвіч возьме баян, ад нашай стомы амаль нічога не застаецца. І доўга яшчэ гарыць касцёр, плывуць над сонным стэпам нашы студэнцкія песні. Тут, ля кастра, праходзілі нашы рэпетыцыі, тут мы рыхтаваліся да канцэртаў, спрачаліся.**

**Асабліва запамятаўся дзень, калі ўзнагароджвалі лепшых байцоў атрада. Горача віншавалі мы нашых саманшчыкаў Толю Бутэвіча, Івана Чыгіра, Валодзю Гураля, цесляроў і бетоншчыкаў Сашу Хазяніна, Колю Турбана, Колю Кароткага, Галю Дзядзюлю і яшчэ многіх іншых.**

**Закончылася цаліна-68. З нейкім шкадаваннем пакідалі мы Казахстан. Кідалі ў Урал капейкі: можа калі-небудзь давядзецца зноў пабываць тут.**

**І вось у пачатку сакавіка на факультэце з'явілася аб'ява, якая зноў запрашала рамантыкаў на цалінныя будоўлі. Камандзірам на гэты раз быў абраны наш лепшы баец-саманшчык Анатоль Бутэвіч. Многія былыя цаліннікі выказалі жаданне паехаць зноў працаваць. І, вядома, былі прыняты з задавальненнем, бо гэта ўжо правераныя таварышы, на якіх можна смела палажыцца. Слоў на вецер яны не кідаюць.**

**Хутка ад'езд. Нас ужо чакае гарачы стэп Прыуралля.**

**С. КРЭПСКІ,**
**баец атрада «Нёман», цаліннік-68.**





*С. ЗАКОННІКАЎ*

## ЛИРИЧЕСКАЯ ЦЕЛИННАЯ

Мы живем далеко, на уральском приволье.
Там, где рыжее солнце берет свой разбег.
Кулундукские ветры и кушумские волны
Все поют и поют эту песню тебе.

Что люблю, не сказал — рано тронулся поезд.
Обгоняя рассвет, догоняя мечту.
Только ты обо мне ну хоть чуточку помни,
А письмо я твое сотни раз перечту.

Здесь работа кипит, вырастают кошары,
И дома к небесам на ладонях плывут.
Будет лучше и краше «студенческий шарик».
Нашим именем улицы здесь назовут.

Лишь тебя не хватает, хорошей и славной,
Но со мною ты рядом в мечтах и в судьбе.
Час разлуки пройдет, и под Минском составы
Вновь гудками споют эту песню тебе.

# ЧАМУ БЕЗ ДЗЯЎЧАТ?

**Цаліна! Удумайцеся ў гэтае слова. Чароўнай музыкай гучыць яно для вопытных цаліннікаў. Усё ў гэтым слове: і воблакі пясчанага пылу, і дым кастроў, і мурзатая казахская дзетвара, і твае сябры, з якімі ты правёў не адзін дзень у бяскрайніх стэпах Казахстана. Але што за цаліна без дзяўчат! Многа добрага ўносяць у жыццё атрада дзяўчаты. Цяплей становіцца на душы ў хлопца ад ласкавай дзявочай усмешкі, ад звонкага яе голасу, што ўплёўся ў хор мужчынскіх галасоў. Але вось што дрэнна. Не хочуць нашы хлопцы браць дзяўчат на цаліну. Калі і бяруць, дык вельмі мала. Не даацэньваюць чамусьці. Вядома, дзяўчаты фізічна слабейшыя за хлопцаў. Але ж дапамагае вялікае жаданне праверыць сябе ў нялёгкай справе.**

**Цаліна — не курорт. Гэта таксама вядома. Трэба больш верыць дзяўчатам, хлопцы. І, канешне, браць іх на цаліну не за іх прыгожыя вочы, а за іх працоўнае сумленне, каб не было сорамна пасля ўсяму атраду. А ў нас на факультэце многа цудоўных дзяўчат, якія б не горш за хлопцаў маглі працаваць на цаліне. Цаліна выхоўвае чалавека, вучыць паважаць працу, крышталізуе адносіны паміж людзьмі. Дык чаму ж адчуваць усё гэта павінны толькі хлопцы!**

**Г. ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**студэнтка філалагічнага факультэта.**

Адказны рэдактар
М. І. ІОСЬКА.

Згубленыя студэнцкія білеты, выдадзеныя БДУ імя У. І. Леніна за № 642260 на імя Лісаковіч Аліны Канстанцінаўны, за № 642267 на імя Алексіевіч Ірыны Іларыёнаўны і за № 640408 на імя Своража Аляксандра Канстанцінавіча, лічыць несапраўднымі.

АТ 03870. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Тыраж 2000 экз. Зак. 889.